# СТАТУТ ФОНДУ ГРАМАДЗЯНСКАГА РАЗВІЦЦЯ «NATION OF LEADERS»

## Раздзел I
## Агульныя палажэнні

### § 1

**Фонд грамадзянскага развіцця «Nation of Leaders»** (далей – «**Фонд**») заснаваны спадарыняй Васілісай Дзегцярэнка (далей – «**Заснавальнік**») на падставе натарыяльнага акта, складзенага ў прысутнасці намесніка натарыуса Ганны Завісляк, намесніка Малгажаты Палган-Пашка – натарыуса ў Варшаве, офіс якога знаходзіцца ў Варшаве і зарэгістраваны ў рэестры А за нумарам 11853/2021.

### § 2

1. Месцам знаходжання Фонду з'яўляецца сталіца Варшава.
2. Фонд ажыццяўляе сваю дзейнасць у Рэспубліцы Польшча і за яе межамі.
3. Фонд можа ствараць філіялы і іншыя арганізацыйныя адзінкі як у Рэспубліцы Польшча, так і за яе межамі згодна з адпаведнымі палажэннямі заканадаўства Польшчы або трэціх краін.
4. Фонд можа быць членам арганізацыі з падобным профілем дзейнасці.

### § 3

Тэрмін дзеяння Фонду неабмежаваны.

### § 4

1. Фонд ажыццяўляе сваю дзейнасць на падставе законаў, дзеючых на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, у прыватнасці на падставе Закона «Аб фондах» ад 6 красавіка 1984 года і на падставе гэтага Статута.
2. Фонд з'яўляецца апалітычным і не звязаны ні з якой рэлігіяй.

### § 5

1. Фонд можа выкарыстоўваць свой адметны графічны сімвал і адпаведнікі сваёй назвы на замежных мовах.
2. Фонд можа выкарыстоўваць пячатку з ідэнтыфікацыйнымі данымі Фонду.
3. Фонд можа ўводзіць значкі і ганаровыя медалі і прысуджаць іх разам іншымі ўзнагародамі суб'ектам, якія маюць заслугі перад Фондам.

## Раздзел II
## Статутныя мэты і сфера дзейнасці Фонду

### § 6

1. Фонд ажыццяўляе статутную дзейнасць, а таксама можа ажыццяўляць камерцыйную дзейнасць.
2. Статутныя мэты Фонду ўключаюць дзейнасць у межах пералічанага ніжэй:
   1) выступленне з ініцыятывамі па падтрымцы развіцця грамадзянскай супольнасці ў незалежнай і дэмакратычнай Беларусі;
   2) выступленне з ініцыятывамі па падтрымцы развіцця грамадзянскай супольнасці ў незалежнай і дэмакратычнай Рэспубліцы Польшча;
   3) выступленне з адукацыйнымі і даследчымі ініцыятывамі ў галіне дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі;
   4) умацаванне ўзаемных культурных і сацыяльных сувязей паміж Рэспублікай Польшча і Беларуссю;
   5) выступленне з адукацыйнымі і даследчымі ініцыятывамі ў галіне дэмакратыі і правоў чалавека ў Рэспубліцы Польшча;
   6) дзеянні па эканамічным і сацыяльным развіцці ў Беларусі і на тэрыторыі Рэспублікі Польшча;
   7) падтрымка дзейнасці па прасоўванні дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі і на тэрыторыі Рэспублікі Польшча;
   8) узмацненне ў грамадстве каштоўнасцей свабоды і справядлівасці як грамадзянскіх прынцыпаў.
3. Фонд можа ажыццяўляць камерцыйную дзейнасць у маштабах, неабходных для рэалізацыі статутных мэт.
4. Прыбытак, атрыманы ў выніку камерцыйнай дзейнасці Фонду, накіроўваецца на рэалізацыю яго

статутных задач.
5. Прадметам камерцыйнай дзейнасці Фонду згодна з Польскім класіфікатарам відаў дзейнасці (PKD) з'яўляецца дзейнасць у вобласці:
   1) дзейнасць вэб-парталаў (PKD 63.12.Z);
   2) навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук (PKD 72.20.Z);
   3) выданне кніг (PKD 58.11.Z);
   4) выданне часопісаў і перыёдыкі (PKD 58.14.Z);
   5) дзейнасць, звязаная з вытворчасцю фільмаў, відэазапісаў і тэлепраграм (PKD 59.11.Z);
   6) даследаванне рынку і грамадскай думкі (PKD 73.20.Z);
   7) дзейнасць, звязаная з арганізацыяй кірмашоў, выставак і кангрэсаў (PKD 82.30.Z);
   8) пазакласныя формы навучання, не аднесеныя да іншых катэгорый (PKD 85.59.Z);
   9) дзейнасць іншых членскіх арганізацый, не аднесеных да іншых катэгорый (PKD 94.99.Z);
   10) рознічны гандаль па пошце ці праз Інтэрнэт (PKD 47.91.Z).

**§ 7**

1. Для рэалізацыі сваіх мэт Фонд:
   1) пастаянна аналізуе стан дэмакратыі ў Беларусі;
   2) арганізоўвае і праводзіць курсы, трэнінгі, сустрэчы клубаў і груп па інтарэсах, канферэнцыі, кангрэсы і круглыя сталы, а таксама навучанні на анлайн-платформах;
   3) ажыццяўляе дзейнасць у падтрымку грамадзянскай пазіцыі, развіцця грамадзянскай супольнасці і дэмакратычных каштоўнасцей у Беларусі і на тэрыторыі Рэспублікі Польшча;
   4) падрыхтоўвае даследаванні і аналізы ў галіне абароны дэмакратыі і правоў чалавека;
   5) праводзіць навуковыя даследаванні і вядзе працу па развіцці ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук;
   6) вядзе выдавецкую дзейнасць;
   7) вядзе дзейнасць, звязаную з дыстрыбуцыяй кніг, фільмаў, відэазапісаў і тэлепраграм, адукацыйных курсаў;
   8) аказвае істотную і фінансавую падтрымку фізічным і юрыдычным асобам, якія выступаюць у абарону дэмакратыі, у тым ліку абаронцам правоў чалавека і іх сем'ям, а таксама сацыяльным актывістам і актывісткам, якія працуюць на карысць дэмакратыі на тэрыторыі Беларусі і Рэспублікі Польшча.
2. Дзеянні, акрэсленыя ў абзацы 1, могуць выконвацца Фондам на платнай ці бясплатнай аснове.

## Раздзел III
## Актывы і даходы Фонду

**§ 8**

1. Актывамі Фонду з'яўляюцца ўстаноўчы капітал у памеры 5000,00 злотых (прапіссю: пяць тысяч польскіх злотых 00/100), з якіх 1000,00 злотых (прапіссю: адна тысяча злотых 00/100) прызначана для камерцыйнай дзейнасці Фонду, а таксама фінансавыя сродкі, нерухомая і рухомая маёмасць і маёмасныя правы, набытыя Фондам у ходзе дзейнасці.
2. Даходы Фонду паступаюць, у прыватнасці, з:
   1) ахвяраванняў, спадчыны і завяшчанняў;
   2) датацый, субсідый і грантаў;
   3) фондаў Еўрапейскага саюза;
   4) даходаў ад нерухомай і рухомай маёмасці і маёмасных правоў;
   5) сродкаў, атрыманых ад урада і органаў мясцовага самакіравання;
   6) камерцыйнай дзейнасці.
3. Даходы ад субсідый, ахвяраванняў, спадчыны і завяшчанняў могуць быць выкарыстаны для дасягнення любой са статутных мэт Фонду, калі толькі донары не вырашылі інакш.
4. Фонд можа ажыццяўляць камерцыйную дзейнасць у маштабах, неабходных для рэалізацыі статутных мэт, у адпаведнасці з прынцыпамі, акрэсленымі ў асобных нарматыўных дакументах. Камерцыйная дзейнасць можа быць толькі спадарожнай, дадатковай дзейнасцю, якая накіравана на атрыманне фінансавых сродкаў для ажыццяўлення і развіцця статутнай дзейнасці Фонду. Даход з камерцыйнай дзейнасці поўнасцю прызначаецца на рэалізацыю статутных мэт.
5. З актываў і даходаў Фонду Праўленне па меры неабходнасці накіроўвае на вядзенне камерцыйнай

дзейнасці сродкі ў памеры, не большым за палову ўстаноўчага капіталу, банкаўскіх працэнтаў устаноўчага капіталу і даходаў ад камерцыйнай дзейнасці.

**§ 9**

У выпадку прызначэння Фонду на атрыманне спадчыны Праўленне падае заяву аб прыняцці спадчыны з вопісам маёмасці і толькі ў тым выпадку, калі падчас падачы гэтай заявы несумненна, што фактычны стан спадчыны значна перавышае даўгі, якія з ім наследуюцца.

**§ 10**

1. Фізічным, юрыдычным асобам ці іншым арганізацыйным адзінкам, якія робяць ахвяраванні ці забяспечваюць субсідыі на карысць Фонду ў выглядзе разавай ці агульнай сумы, роўнай мінімум 50 000,00 злотых або 10 000 (дзесяць тысяч) долараў ЗША/еўра ў выпадку, калі гэтыя асобы з іншых краін, можа быць нададзена званне спонсара Фонду, калі яны гэтага пажадаюць.
2. Званне спонсара прызначаецца асабіста.
3. Фізічныя, юрыдычныя асобы ці іншыя арганізацыйныя адзінкі, якія зрабілі адметны ўнёсак у дзейнасць Фонду ці прасоўваюць яго дзейнасць, могуць атрымаць званне амбасадора Фонду, калі яны гэтага пажадаюць.

## Раздзел IV
## Органы кіравання Фонду

**§ 11**

Органамі кіравання Фонду з'яўляюцца:
1) Праўленне Фонду;
2) Савет Фонду.

### Праўленне Фонду

**§ 12**

1. У склад Праўлення Фонду ўваходзяць ад 2 (дзвюх) да 5 (пяці) асоб, у тым ліку старшыня Праўлення, якія назначаюцца на трохгадовы тэрмін. Член Праўлення можа займаць пасаду не больш за адзін тэрмін.
2. Праўленне Фонду выбіраецца Саветам Фонду.
3. Членства ў Праўленні спыняецца ў выніку:
   1) падачы пісьмовай заявы аб адстаўцы ў Савет Фонду;
   2) асуджэння канчатковым прыгаворам за злачынства, здзейсненае наўмысна;
   3) смерці ці страты праваздольнасці;
   4) зняцця з пасады па ініцыятыве Савета Фонду.
4. Праўленне ў цэлым або любы з яго членаў могуць быць адхілены ад дзейнасці Саветам Фонду да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў.
5. Праўленне кіруе дзейнасцю Фонду і выступае ад яго імені.

**§ 13**

1. Да кампетэнцый Праўлення Фонду адносяцца:
   1) прадстаўленне Фонду ў адносінах з іншымі асобамі;
   2) нагляд за актывамі Фонду;
   3) кіраванне бягучай дзейнасцю Фонду;
   4) прыняцце нарматыўных дакументаў і ўнутраных актаў Фонду;
   5) прыняцце ахвяраванняў, спадчыны і завяшчанняў;
   6) распрацоўка планаў дзейнасці Фонду;
   7) прыняцце рашэнняў аб прыёме на працу, прынцыпах аплаты працы і памеры сродкаў на выплату ўзнагароджання і прэмій працаўнікам Фонду;
   8) стварэнне і ліквідацыя арганізацыйных адзінак Фонду;
   9) унясенне прапаноў наконт змяненняў Статута Фонду, змяненняў мэт Фонду, зліцця ці ліквідацыі Фонду і прызначэння яго актываў;
   10) падрыхтоўка справаздач аб дзейнасці Фонду;

11) увядзенне значкоў, медалёў і ганаровых званняў, прэмій і іншых адзнак і ўзнагароджанне імі

заслужаных асоб Фонду ці арганізацый, якія рэалізуюць яго мэты.
2. Кожны год Праўленне абавязана падаваць у Савет Фонду штогадовую справаздачу аб дзейнасці Фонду.

§ 14

1. Пасяджэнне Праўлення Фонду можа быць склікана па ініцыятыве кожнага члена Фонду. Пасяджэнне ўзначальваецца старшынёй, а ў выпадку яго адсутнасці – іншым членам, выбраным членамі Праўлення, якія прысутнічаюць.
2. Асоба, якая склікае пасяджэнне, павінна праінфармаваць усіх членаў Праўлення Фонду аб месцы і даце правядзення пасяджэння па электроннай пошце, пошце ці тэлефоне не менш чым за 3 дні да запланаванага пасяджэння.
3. Праўленне прымае рашэнні ў форме рэзалюцый простай большасцю галасоў у прысутнасці мінімум паловы ад агульнай колькасці яго членаў, у тым ліку старшыні Праўлення Фонду, калі палажэнні Статута не прадугледжваюць іншае. У выпадку роўнай колькасці галасоў рашаючым з'яўляецца голас старшыні Праўлення.
4. Праўленне праводзіць пасяджэнні не радзей за адзін раз у год.
5. Члены праўлення і старшыня Праўлення могуць мець працоўныя адносіны з Фондам.

## Савет Фонду

§ 15

1. У склад Савета Фонду ўваходзяць ад 3 (трох) да 5 (пяці) членаў.
2. Савет Фонду выбіраецца на трохгадовы тэрмін. Савет выбірае старшыню сярод сваіх членаў, які будзе кіраваць яго працай, і віцэ-старшыню.
3. Членаў першага складу Савета назначае заснавальнік. Наступныя члены Савета замест асоб, якія спынілі выкананне сваіх абавязкаў, або для пашырэння складу Савета назначаюцца па рашэнні Савета Фонду, пры гэтым заснавальнік мае права назначаць і вызваляць ад выканання абавязкаў двух членаў Савета. Заснавальнік можа назначаць, абавязкова ў пісьмовай форме з натарыяльна засведчаным подпісам, фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе выкананне вышэйзгаданых паўнамоцтваў, з правам наступнага дэлегавання гэтых паўнамоцтваў.
4. У асабліва абгрунтаваных выпадках член Савета можа быць вызвалены ад выканання абавязкаў і пазбаўлены членства ў Савеце ў выніку прыняцця рэзалюцыі астатнімі членамі Савета.
5. Членства ў Савеце спыняецца ў выніку:
   1) падачы пісьмовай заявы аб адстаўцы;
   2) асуджэння канчатковым прыгаворам за злачынства, здзейсненае наўмысна;
   3) смерці ці страты праваздольнасці;
   4) зняцця з пасады па ініцыятыве Савета Фонду.
6. Членства ў Савеце Фонду не можа сумяшчацца з членствам у Праўленні.
7. У склад Савета можа ўваходзіць заснавальнік.

§ 16

Савет Фонду – гэта орган кіравання з ініцыятыўнымі і кансультацыйнымі паўнамоцтвамі, а таксама орган унутранага кантролю і нагляду.

§ 17

1. Савет Фонду працуе на пасяджэннях, якія праводзяцца мінімум адзін раз у год, а таксама ажыццяўляе інспекцыйную дзейнасць у тым аб'ёме і ў той тэрмін, якія ім вызначаюцца.
2. Пасяджэнні Савета склікаюцца старшынёй Савета Фонду па ўласнай ініцыятыве або па запыце Праўлення.
3. Пасяджэнне Савета можа быць склікана ў пазачарговым парадку для разгляду справы асобага характару па ініцыятыве Праўлення Фонду ці па пісьмовым запыце старшыні Савета або мінімум двух яго членаў.
4. Пасяджэнні Савета ўзначальвае старшыня ці віцэ-старшыня.
5. Члены Савета могуць атрымліваць кампенсацыі абгрунтаваных расходаў пры выкананні сваіх абавязкаў у гэтым органе кіравання або ўзнагароджанне ў памеры, не вышэйшым за сярэднямесячнае ўзнагароджанне ў сферы бізнесу, аб'яўленае старшынёй Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення за папярэдні год.

6. У пасяджэннях Савета прымаюць удзел прадстаўнікі Праўлення Фонду.

## § 18

1. Членам Савета Фонду не можа быць асоба, асуджаная канчатковым прыгаворам за наўмысна здзейсненае злачынства, якое праследуецца па дзяржаўнай ініцыятыве, або за падатковае злачынства.
2. Члены Савета Фонду не могуць быць членамі Праўлення, ці знаходзіцца ў шлюбе з членам Праўлення, ці быць у сваяцтве, блізкасці з членам Праўлення ці падпарадкаванні яму ў сувязі з працай.

## § 19

Рэзалюцыі Савета Фонду прымаюцца простай большасцю галасоў у прысутнасці мінімум паловы яго членаў, калі Статут не прадугледжвае іншае. У выпадку роўнай колькасці галасоў рашаючым з'яўляецца голас старшыні Праўлення, а ў выпадку яго адсутнасці – віцэ-старшыні.

## § 20

Да задач Савета Фонду адносяцца:

1) вызначэнне галоўных кірункаў дзейнасці Фонду;
2) выказванне меркаванняў наконт шматгадовых і штогадовых праграм дзейнасці Фонду;
3) выказванне меркаванняў па справах, прапанаваных Праўленнем;
4) нагляд і кантроль за дзейнасцю Фонду, у прыватнасці кантроль за станам актываў Фонду;
5) разгляд і зацвярджэнне штогадовых справаздач Праўлення Фонду аб яго дзейнасці;
6) зацвярджэнне штогадовай фінансавай справаздачнасці Фонду;
7) вызваленне Праўлення ад адказнасці;
8) зацвярджэнне правілаў Фонду, у прыватнасці правілаў карыстання актывамі і льготамі Фонду;
9) прыняцце рэзалюцый па справах, вызначаных у Статуце;
10) назначэнне і вызваленне ад выканання абавязкаў членаў Праўлення, у тым ліку старшыні Праўлення;
11) прыняцце рашэнняў аб змяненні Статута Фонду;
12) прыняцце рашэнняў аб зліцці з іншым фондам або ліквідацыі Фонду;
13) прыняцце рашэнняў па ўсіх іншых справах, якія не адносяцца да кампетэнцый іншых органаў кіравання Фонду;
14) выказванне згоды з продажам, здачай у арэнду або поўнай ці частковай нагрузкай на дзейнасць Фонду;
15) выказванне згоды з купляй ці продажам нерухомай маёмасці, правоў бестэрміновага выкарыстання ці долей у нерухомай маёмасці і часткі правоў бестэрміновага выкарыстання.
16) Выказванне згоды з ажыццяўленнем дзейнасці, якая перавышае 100 000 еўра (сто тысяч еўра).

## § 21
## Прыняцце рэзалюцый і арганізацыя пасяджэнняў з дапамогай электронных сродкаў камунікацыі

1. Рэзалюцыі органаў кіравання Фонду могуць быць прыняты ў пісьмовай форме шляхам выкарыстання сродкаў дыстанцыйнай сувязі.
2. Калі члены органаў кіравання Фонду выказалі згоду ў дакументальнай форме, галасаванне па-за пасяджэннямі органаў кіравання Фонду можа адбывацца з выкарыстаннем электронных сродкаў камунікацыі.
3. Магчымасць удзелу ў пасяджэнні органаў кіравання Фонду з выкарыстаннем электронных сродкаў камунікацыі вызначаецца ў паведамленні аб гэтым сходзе, якое змяшчае падрабязнае апісанне спосабу ўдзелу і выкарыстання права голасу.
4. Электронныя сродкі камунікацыі выкарыстоўваюцца ў галасаванні на пасяджэннях органаў кіравання Фонду пры наяўнасці мінімум адной з наступных умоў:
   1) трансляцыя пасяджэння ў рэжыме рэальнага часу;
   2) двухбаковая сувязь у рэжыме рэальнага часу, у рамках якой член органаў кіравання Фонду можа выступаць у ходзе пасяджэння;
   3) выкарыстанне права голасу асабіста ці праз даверану асобу перад пасяджэннем ці падчас яго.

## Раздзел V
## Спосаб прадстаўлення і прыняцця фінансавых абавязацельстваў

### § 22

На выказванне волевыяўлення ад імені Фонду, у тым ліку ў маёмасных справах, упаўнаважваецца старшыня Праўлення самастойна або два члены Праўлення, якія дзейнічаюць сумесна.

### § 23

Забараняецца:

1) выдаваць пазыку ці забяспечваць абавязацельствы актывамі Фонду ў дачыненні да яго членаў, членаў органаў кіравання або працаўнікоў і асоб, з якімі члены Фонду, члены органаў кіравання і працаўнікі знаходзяцца ў шлюбе, па-за шлюбнай сувязі ці ў сваяцтве або далёкім сваяцтве па прамой лініі, у сваяцтве або далёкім сваяцтве па бакавой лініі да другога ўзроўню або звязаны па прычыне ўсынаўлення, догляду ці апекі, якія далей называюцца «блізкімі асобамі»;
2) перадаваць актывы Фонду на карысць яго членаў, членаў органаў кіравання або працаўнікоў ці іх блізкіх асоб на ўмовах, якія адрозніваюцца ад тых, што прымяняюцца да трэціх асоб, у прыватнасці, калі перадача ажыццяўляецца бясплатна ці на льготных умовах;
3) выкарыстоўваць актывы на карысць яго членаў, членаў органаў кіравання або працаўнікоў і іх блізкіх асоб на ўмовах, якія адрозніваюцца ад тых, што прымяняюцца да трэціх асоб, калі толькі такое выкарыстанне не вынікае непасрэдна са статутнай мэты;
4) набываць тавары ці паслугі ад суб'ектаў, у якіх удзельнічаюць члены Фонду, члены яго органаў кіравання ці працаўнікі або іх блізкія асобы, на ўмовах, якія адрозніваюцца ад тых, што прымяняюцца да трэціх асоб, або па цэнах, вышэйшых за рынычныя.

## Раздзел VI
## Змяненне Статута

### § 24

1. Рашэнні па ўнясенні змяненняў у Статут прымаюцца Саветам Фонду шляхам прыняцця рэзалюцыі 2/3 большасці галасоў, у прысутнасці мінімум паловы яго членаў, у тым ліку старшыні або віцэ-старшыні, пасля атрымання згоды заснавальніка, афармленай у пісьмовым выглядзе з натарыяльна засведчаным подпісам. Заснавальнік можа назначаць, абавязкова ў пісьмовай форме з натарыяльна засведчаным подпісам, фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе выкананне вышэйзгаданых паўнамоцтваў, з правам наступнага дэлегавання гэтых паўнамоцтваў.
2. Змяненне Статута можа датычыцца мэт, для рэалізацыі якіх быў заснаваны Фонд і якія акрэслены ва ўстаноўчым акце, аднак такое рашэнне павінна быць аднагалосным у прысутнасці ўсіх членаў Савета Фонду пасля атрымання згоды заснавальніка, афармленай ў пісьмовым выглядзе з натарыяльна засведчаным подпісам. Заснавальнік можа назначаць, абавязкова ў пісьмовай форме з натарыяльна засведчаным подпісам, фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе выкананне вышэйзгаданых паўнамоцтваў, з правам наступнага дэлегавання гэтых паўнамоцтваў.

## Раздзел VII
## Заключныя палажэнні

### § 25

1. Для эфектыўнага дасягнення сваіх мэт Фонд можа аб'ядноўвацца з іншым фондам.
2. Рашэнне аб аб'яднанні прымае Савет Фонду шляхам прыняцця аднагалоснай рэзалюцыі пасля атрымання згоды заснавальніка, афармленай у пісьмовым выглядзе з натарыяльна засведчаным подпісам. Заснавальнік можа назначаць, абавязкова ў пісьмовай форме з натарыяльна засведчаным подпісам, фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе выкананне вышэйзгаданых паўнамоцтваў, з правам наступнага дэлегавання гэтых паўнамоцтваў.

### § 26

1. Фонд ліквідуецца ў выпадку дасягнення мэт, дзеля якіх ён быў заснаваны, ці вычэрпвання яго

фінансавых сродкаў і актываў.

2. Рашэнне аб ліквідацыі прымае Савет Фонду шляхам прыняцця аднагалоснай рэзалюцыі пасля атрымання згоды заснавальніка, афармленай у пісьмовым выглядзе з натарыяльна засведчаным подпісам. Заснавальнік можа назначаць, абавязкова ў пісьмовай форме з натарыяльна засведчаным подпісам, фізічную ці юрыдычную асобу, якая возьме на сябе выкананне вышэйзгаданых паўнамоцтваў, з правам наступнага дэлегавання гэтых паўнамоцтваў.

**§ 27**

Актывы, што засталіся пасля ліквідацыі Фонду, перадаюцца з улікам палажэнняў артыкула 5 абзаца 4 Закона «Аб фондах» установам, чыя дзейнасць адпавядае статутным мэтам Фонду.

**§ 28**

Фінансавым годам з'яўляецца каляндарны год.

**Васіліса Дзегцярэнка** – старшыня Праўлення

______________________

*(уласнаручны подпіс)*

**Святлана Крыніцкая** – член Праўлення

______________________

*(уласнаручны подпіс)*

**Ірына Базылевіч** – член Праўлення

______________________

*(уласнаручны подпіс)*